Тыднёвік Магілёўскі

№ 1 (1)

Да нашых чытачоў

Рызыкоўная справа распачынаць сёння новую газету. Палітычныя і эканамічныя ўмовы, якія бессаромна і нахабна ўсталёўваюцца ў краіне, наогул варожыя да ўсяго, што можна пазначыць словам "новае". Вітаецца і заахвочваецца вяртанне назад. Да старой ідэалогіі. Старой камандвай эканомікі. Старога прачытання гісторыі. Старой непавагі да законнасці і нормаў маралі. Старых сімвалаў і святаў. Старых партыйна-дзяржаўных дзеячаў камуністычнага будаўніцтва.

Усё гэта красамоўна даказала сваё поўнае банкруцтва. Нездарма ўсе нашыя суседзі па савецкай імперыі і сацыялістычнаму лагеру (якое дакладнае слова) бягуць ад усяго гэтага з хуткасцю, на якую толькі здольныя. Ну, а мы нават і на месцы не стаім. Мы вяртаемся назад і таксама даволі шпарка. Хаця і робіцца гэта ў афарбоўцы быццам новай лексікі, быццам пад сцягам руху за незалежнасць, быццам для забеспячэння правоў і свабод чалавека.

Я мог бы на гэты конт нямала парасказаць аб тым, як пакутліва рэгістравалася наша газета: у законе адно — гэта новае, на практыцы іншае — гэта старое. І практыка мацней за закон. Спытайце аб гэтым любога прадпрымальніка (толькі не з ТОРГЭКСПО і не з КАМАРОЎКІ), любога суддзю, настаўніка, селяніна, грамадскага актывіста, не гаворачы пра апазіцыянераў. Добра яшчэ, калі з вашага пытання яны па-простаму пасмяюцца. Тады спытайце пра гэта ў самix сябе.

Тым не менш задушана і знішчана пакуль не ўсё. Вы трымаеце ў руках НОВУЮ газету. Яна не будзе вам ні пры якіх абставінах хлусіць. Яна будзе берагчы вобар матчынай мовы. Яна будзе паведамляць факты, але найперш — аналізаваць іх... Яна будзе гаварыць пра тое, аб чым многія з нас за апошнія часы дноў навучыліся не толькі маўчаць, а і не думаць.

Але як не думаць, калі гэта наша краіна? Як маўчаць, калі гэта наша жыццё? А жыццё і краіна апынуліся ў сённяшнім стане і працягваюць апускацца ў багну па нашай агульнай віне і з нашага дазволу — вось што мы будзем даводзіць сваім чытачам у кожным нумары газеты. Хапае і без нас дзеячаў і журналістаў, якія лісцяцца да народа: "народ разберется", "народ поддержит"... Верым і мы, што народ разбярэцца. Не было б толькі позна. Бо далёка забег наш падманугы народ ад думак, учынкаў, ды і самога жыцця. А далей бегчы ад сябе немагчыма і небяспечна.

Трэба вяртацца. Слова тут многае значыць. Слова наогул многае значыць, бо яно, як вядома, пачатак усяму. А пачатак патрабуе працягу.

Так што да сустрэчы ў наступную пятніцу.

Генадзь СУДНІК,
рэдактар Тыднёвіка

Апошняя сесія "Апошняга з магікан"

Апошнюю сесію правёў "стары" Магілёўскі гарадскі Савет.

Савет застаўся адным з нямногіх "мясцовых парламентаў", які перавысіў адведзены тэрмін працы аж на 2 гады, паколькі новы не быў выбраны. Адпачатку Савет праславіўся тым, што насуперак памкненням старой наменклатуры, абраў мэрам горада папулярнага ў народзе Сяргея Габрусева. Другі раз гарсавет праславіўся, калі зняў з пасады таго ж Сяргея Габрусева. За 3 гады свайго кіравання горадам мэр паспеў пасварыцца з дэмакратамі, якіх усё менела, ды так і не здолеў стаць "сваім" для старой наменклатуры. У вачах жа выбаршчыкаў мэр згубіў усё, калі атрымаў па-за чаргой новую кватэру. Аднак, менавіта С.Габрусеў стаў адзіным кіраўніком, якога і выбралі, і знялі не па загаду "зверху", а дэмакратычным шляхам. Далей усё ў гарсавеце вярнулася на кругі свае. Ён стаў "кішэнным", як усе астатнія, бездакорна рэагуючы на любыя прапановы "вертыкалі". Так прайшла і апошняя сесія. Дэпутаты разышліся ў чаканні новых 10 калегаў, якіх горад павінен выбраць у нядзелю.

СЫМОН ГЛАЗШТЭЙН.

Гавораць, што паслязаўтра ў нас выбары

Праўда, даведацца пра гэта можна толькі па сціплых шчытах на дзвярах выбарчых участкаў, або пры ўмове, калі да вас на кватэру завітае кандыдат. Улада на гэты раз тут не пры чым. Гэтыя выбары (давыбары) ёй як раз патрэбныя. Не прызначаць жа дэкрэтам і мясцовых дэпутатаў. Аднак улада забылася, як арганізоўваць выбары. Апошнім часам яна набыла зусім іншы навык: як іх зрываць. Чаго былі вартыя словы прэзідэнта падчас апошняй выбарчай кампаніі, шчыра сказаныя ім на ўсю краіну: "Я на выбары не пайду". За гэтым "атхраменіем" так і чыталася наступная парада — "І ВАМ НЕ САВЕТУЮ". Што людзі і зрабілі. Ну, і жыў электарат, ды і ўлада, спакойна, без усялякіх там выбранніках народа, якія ўсё роўна нічога не вырашаюць.

Аднак прадстаўнічая ўлада ўсё-такі спатрэбілася. Без яе надта ўжо непрыстойна, няма чым дэкарыраваць дыктатуру. Вось і прызначылі выбары-давыбары. Але без "вдохновения", гэта вам не рэферэндум. Дзенідзе толькі і хапіла штатных ідэолагаў пры ўладзе, што на заклік да "грамадзянскага абавязку". Яго выкананне ў Магілёве прызначана на 23 сакавіка.

Вы, паважаны чытач, ці чулі пра гэта? Гавораць, у нас выбары ў нядзелю.

Г.С.

DEFENOITE LIBERTATEM!

Абараняйце свабоду!

Сёння ў МЕНСК прыбывае делегацыя вядомай міжнароднай арганізацыі "АРТІКЛЬ XIX". Госці з Лондона будуць працаваць у шчыльным кантакце з сябрамі Беларускай лігі правоў чалавека. Рэч у тым, што ім даручана падрыхтаваць для Камітэта ААН па правах чалавека даклад аб грубых парушэннях урада ды іншых дзяржаўных органаў Беларусі ў галіне свабоды слова, інфармацыі.

У сувязі з гэтым кіраўнік беларускай арганізацыі па правах чалавека Яўген Новікаў звярнуўся да ўсіх журналістаў, асабліва тых, хто працуе ў глыбінцы, з просьбай паведаміць аб фактах заціску сумленных работнікаў друку і свабоды слова.

Свае заўвагі, прэтэнзіі трэба перадаваць па тэлефаксу ў Менску 231-75-50, альбо дасылаць на адрас: 220050, Менск а/с 23, Беларуская ліга правоў чалавека.

Уласная інфармацыя.

У шэсці і мітынгу прынялі ўдзел намеснік старшыні гарвыканкама і міліцыянты. Але выступіць не рызыкнулі

Адразу паведамлю, што святкаванне дэмакратычнымі арганізацыямі ў Магілёве Дня Канстытуцыі абыйшлося без эксцэсаў. Але ў афарбоўцы напружання, чыноўнай перастрахоўкі і звычайнай абыякавасці большасці гараджан. Дэмакраты святкавалі Канстытуцыю 1994, краіна пачала жыццё па Канстытуцыі, прынятай апошнім "рэферэндумам", які ва ўсім свеце прызнаюць толькі Лукашэнка і ягоныя маскоўскія сябры. Тым не менш, паколькі ўлада забылася выкрасліць са святочнага дзяржаўнага календара Дзень прыняцця той, першай Канстытуцыі, не дапусціць святкавання было не проста. Хаця, у адпаведнасці з апошнім дэкрэтам прэзідэнта, для мітынгу магіляўчанам адвялі "рэзервацыю" каля Дома культуры завода ім.Куйбышава. Шэсце не дазволілі зусім, плошчу ім. Леніна ацапілі міліцыяй, каб не дапусціць на ёй збору людзей. Дэманстранты сабраліся побач і рушылі да месца мітынгу праз увесь горад пад пільным наглядам соцень міліцыянтаў, што суправаджалі не вельмі шматлікую калону пад бел-чырвона-белым сцягам (да пяцісот чалавек) і ў пешым строі, і на машынах. Гэткую б сілу, ды на барацьбу са злачынцамі! Уражвалі таксама такія эпізоды, як жывая міліцэйская заслона па ўсяму маршруту да мітынговай пляцоўкі, колькасць "задзействаванага" аўтатранспарту, увесь палкоўніцкі бамонд, наглядаўшы з міні-перагаворнымі прыстасаваннямі ў руках, ды неверагодная колькасць відэаапаратараў і фотакарэспандэнтаў "у штацкім". Дэманстранты час ад часу скандзіравалі не толькі заклік "Жыве Беларусь", але і вясёлы "Слава беларускай міліцыі".

На мітынгу выступілі з асуджэннем палітыкі прэзідэнта і непрызнаннем навязанай краіне новай канстытуцыі А.Фёдараў, В.Сівуха, А.Сердзюкоў, У.Цурпанаў, В.Волкаў і іншыя ўдзельнікі святкавання. Была прадастаўлена магчымасць выступіць намесніку старшыні гарвыканкама У.Цумараву, які мужна дабыў увесь мітынг да канца. Але ён не скарыстаў магчымасць выкласці сабраўшымся сваю пазіцыю з нагоды апошніх падзей. А яны выглядаюць не лепшым чынам: у Магілёве ўсё забараняецца — мітынгі, шэсці, канцэрты рок-гуртоў, арганізатары праследваюцца, затрымліваюцца, штрафуюцца. Калі ў гэтым ёсць дзяржаўная неабходнасць, калі гэта адпавядае сутнасці цяперашняга моманту, вось бы адкрыта і пераканаўча і паведаміць аб гэтым людзям, што падаліся не на тыя заклікі. Тым больш, што ў шэсці і мітынгу, як ніколі раней, прыняло ўдзел шмат моладзі. Але ў нашай дзяржаве дзе ўжо ёсць адзін "самы-самы" кіраўнік, іншым лепш не імправізаваць ад сябе. Дадуць загад выступіць — выступлю, сказалі маўчаць — маўчу.

Святкаванне Дня Канстытуцыі каля Дома культуры скончылася аўтарскай песняй Ігара Мухіна-Рабянка "Да сустрэчы". Магчыма і так, бо наперадзе шмат падстаў для праяўлення дэмакратамі сваіх адносінаў да цяперашняй палітыкі прэзідэнта. І яны не збіраюцца ўтойваць гэта ад грамадскасці. Ну, а запалохаць іх, як гэта было відавочна ў мінулую суботу, немагчыма.

ГЕНАДЗЬ СУДНІК.

25 сакавіка 1918 г. была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка. Патрыёты краіны адзначаюць гэты гістарычны дзень як Дзень ВОЛІ. Віншуем усіх са СВЯТАМ!

Жыццё народнае, Бацькаўшчына — адвечная

25 сакавіка... Чым яно ёсць для Беларусі? Нейкай недарэчнасцю, збегам выпадковых акалічнасцяў ці падзеяй, якая значна паўплывала на ходу найноўшай гісторыі Беларусі?

Перш чым адказаць на гэтае пытанне, узгадаем тагачасны гістарычны фон, на якім разгортваліся падзеі. Напрыканцы 18-га ст. беларускія землі ў выніку распаду Рэчы Паспалітай былі інкарпараваны Расіяй. Што адбылося потым? Расія прынесла на Беларусь сваю, расійскую форму прыгону. Мясцовы, так бы мовіць, родны — таксама быў не пернік. Але ў нас селянін быў прымацаваны да ЗЯМЛІ, а не з'яўляўся непасрэднай уласнасцю пана. Прадаць можна было вёску з зямлёю, але НЕ ЧАЛАВЕКА. А ў Расіі абвесткі аб продажы шчанюкоў межавалі побач з паведамленнямі аб гандлі людзьмі. Гэта было першае "інтэграцыйнае" дасягненне, прынесенае на Беларусь акупантамі. А яшчэ дадаліся рэкрутчына, падаткі ў звонкай манеце (золатам ды срэбрам), а не асігнацыямі, як на ўласна расійскіх землях.

Але і гэта было яшчэ не ўсё. Пачалася жорсткая палітыка русіфікацыі. "Обрусить, дабы волками в лес не смотрели", — гэта яшчэ Екацярына(!!!) сказала пра нас, беларусаў. Перапісвалася гісторыя, забаранялася мова. Нават у назвах не мусіла быць Літвы (тагачаснай заходняй і цэнтральнай Беларусі) і самой Беларусі (Магілёўшчына, Віцебшчына, Смаленшчына), а павінен быць давеку "Северо-Западный край" або "Западная Россия". За гэта мусім дзякаваць і другому дабрадзею з Расіі — цару Нікалаю!

Разабраліся "старэйшыя браты" і з рэлігіяй. Бізунамі ды стрэльбамі гналі вуніятаў у праваслаўе, уціскалі рыма-каталікоў. Праваслаўны беларускі клір і праваслаўную беларускую літургічную літаратуру таксама чакалі рэпрэсіі. Пасля 1812 г. на працягу амаль усяго стагоддзя цяжка прыгадаць праваслаўнага епіскапа — беларуса. Абразы беларускай работы сталіся "некананічнымі", акупанты нявечылі нашу архітэктуру, перараблялі беларускія храмы на свой капыл, беларускія малітоўнікі і літургічная літаратура забараняліся і выводзіліся з ужытку.

Але, калі свабоднаму чалавеку, ведаючаму, чым ёсць Воля, плююць у твар і ставяць на калені, то ён пачынае бараніць сваю годнасць. 1794, 1830-1831, 1863... У гэтыя гады беларускія землі скаланалі паўстанні. Тысячы лепшых сыноў краіны — нерэалізаваны інтэлектуальны патэнцыял нацыі — паляглі застрэленымі, гойдаліся на шыбеніцах, звінелі кайданамі ў Сібіры.

Здавалася, што растапталі беларускі народ да рэшты, здавалася, што — усё! Няма Беларусі, няма беларусаў. Але ў адказ на пытанне: "ХТО ВЫ?", ад беларускага селяніна і польскі, і расійскі этнографы чулі цвёрдае: "МЫ ТУТЭЙШЫЯ, НАША КРАІНА НЯ РУСКАЯ І НЯ ПОЛЬСКАЯ, А ЗАБРАНЫ КРАЙ".

Беларусь, скрываўленая і стаптаная, расціла, як тая Марыя Хрыста, сваё будучае, сваіх дзяцей, беларускую інтэлігенцыю, што выходзіла і з шляхецкіх фальваркаў, і з гарадскіх дамоў, і з-пад саламяных сялянскіх стрэхаў. Нарадзілася паколенне, стварыўшае навуку пра Беларусь. З'яўляюцца свае, уласныя гісторыкі, этнографы, пісьменнікі і паэты. Зіхоткай зоркай успыхнула "Наша Ніва", а разам з ёй беларусы пачулі сваіх прарокаў. Вось найбольш яркія імёны: М.Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас, А.Гарун... І раптам усе пабачылі, што краіна жывая, што СВЯТЫ ДУХ ВОЛІ не пакінуў гэту зямлю.

25 сакавіка 1918 г. Беларусь прамовіла ўсяму свету аб сваім праве на свабоду і незалежнасць. Беларуская Народная Рэспубліка — гэта адказ на подпасці бальшавіцкай Масквы за разгон у снежні 1917 г. легітымнага беларускага заканадаўчага органа — Ўсебеларускага З'езда, што прадстаўляў усю Беларусь. Гэта быў і адказ на безсаромны гандаль Беларуссю Леніным і Троцкім у Брэсце (Брэсцкі мір).

БНР не была фікцыяй, у 1919-1920 гг. дэ-юрэ або дэ-факта яе прызналі Германія, Латвія, Літва, Эстонія, Чэха-Славакія, Балгарыя, Фінляндыя, Турцыя. БНР не была пустым гукам і ў вачах беларускага народа. У красавіку-траўні 1919г. пад нагамі чужынцаў літаральна гула зямля. У ваколіцах Гомеля, Кармы, Рэчыцы, Рагачова, Барысава, Слуцка, Несвіжа, Старобіна ды іншых гарадоў і мястэчак выбухнулі паўстанні беларускіх сялян. Тады ж беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў распачала барацьбу супраць акупантаў на два франты — польскіх легіянераў Пілсудскага і чырвоных войскаў Масквы. Беларускія ж эсэры ўзнялі знакамітае Слуцкае паўстанне (1920 г.). Бальшавікі патапілі яго і іншыя выступленні за волю ў крыві. Няўдалым атрымалася агульнабеларускае паўстанне супраць Рыжскай "мірнай" дамовы паміж Расіяй і Польшчай, што нанова ірвала на кавалкі жывое цела Беларусі. Учарашнія класавыя антаганісты — польская дэфензіва і расійская ВЧК — правялі сумесную "бліскучую" аперацыю па арышту некалькі тысячаў актывістаў, тым чынам пазбавіўшы акцыю кіраўнікоў. І хоць ні палякі на захадзе Беларусі, а рускія на ўсходзе не маглі яшчэ шмат гадоў спаць спакойна, спадзеваў на законнае вяртанне ўрада Беларусі ўжо не было.

Аднак, мусім памятаць тую акалічнасць, што бальшавікі вымушаныя былі лічыцца з патрабаваннямі беларусаў аб узнаўленні іх дзяржаўнасці і пайсці на ўтварэнне БССР. Без 25 сакавіка 1918 г., без БНР не было б і БССР, адпаведна не было б сённяшняй Рэспублікі Беларусь. Быў бы "Северо-Западный край", бо немагчыма было пасля гэткіх гістарычных падзей не лічыць беларускага народа і Беларусі СУБ'ЕКТАМІ самастойнай ГІСТОРЫІ.

Тыя людзі, удзельнікі нашай вольнай гісторыі, — светлыя, разумныя, чыстыя — не вагаючыся паклалі на алтар Бацькаўшчыны ўсё: дабрабыт, кар'еру, само жыццё. Большасць з іх памерла не сваёй смерцю, загінула ў баях за Беларусь альбо закатавана ў ленінска-сталінскіх Гулагах.

Аднак сёння, ў гэты святы і светлы дзень, памятайма — іх ахвяры былі недарэмныя. Будзем дастойнымі іх высакародных жыццяў. Свабодны чалавек заўсёды выбірае свабоду. Жыццё кароткае, Бацькаўшчына адвечная — хай гэты дэвіз старажытных рымлянаў будзе сягоння нашым, як тое было для творцаў Беларускай Народнай Рэспублікі.

Т.ТУТЭЙШЫ, гістарычны аглядальнік ТЫДНЁВІКА.

Максім БАГДАНОВІЧ

Пагоня

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, —
Ўспомню Вострую Браму сьвятую
І ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, —
Рвуцца, мкнуцца і цяжка
хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць,
не стрымаць...

У бязьмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню сьпяшыцеся?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясьліся
За тваімі дзяцьмі ўздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Біце ў сэрцы іх — біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

Маці родная, Маці — Краіна!
Не усьцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач. Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць,
не стрымаць.

Дэкларацыя правоў чалавека: і можна, і нельга

Бліскучы прыклад таго, як прынятае рашэнне можа быць ні аб чым, паказала магілёўская Феміда.

Гутарка ідзе аб справе распаўсюджвальніка Дэкларацыі правоў чалавека, настаўніка з Магілёва Уладзіміра Лабцэвіча, які "за Дэкларацыю" быў затрыманы міліцыяй і на яго склалі пратакол. СВАБОДА паведамляла аб валтузні вакол гэтай справы. Пасля адміністрацыйная камісія "апраўдала" яго. І Лабцэвіч падаў у суд на міліцыю з зыскам на яе неправамерныя дзеянні.

Пасля ў падзеі ўмяшалася сама ААН, чыё прадстаўніцтва ў Беларусі паведаміла ў Цэнтральны райсуд абласнога цэнтра, што Дэкларацыю ў краінах-сябрах ААН можна распаўсюджваць без абмежаванняў. Пасля ааанаўскага ліста адбылося паседжанне суда. На ім міліцыянты сцвярджалі, што яны з Лабцэвічам нічога не рабілі, а гэта ён сам пайшоў у пастарунак, палаяўся з участковым і сыйшоў. Таму "ветлівыя" служкі правапарадку ажно мусілі скласці на яго пратакол і запатрабаваць штрафу. Суд прыняў "саламонава" рашэнне. З аднаго боку, Лабцэвіч не вінаваты, але, з другога боку, і міліцыя, што яго затрымлівала, таксама ўсё рабіла правільна. Юрыспрудэнцыя — складаная навука, ці не так?

Сымон Глазштэйн.

Анекдот, ды і толькі

Юры Хадыка... Летась яго, лідэра БНФ, прафесара фізікі па прафесіі, філосафа па складу розума, патрыёта Бацькаўшчыны па перакананнях, трымалі за кратамі без суда разам з Вячаславам Сіўчыкам, старшынём Управы БНФ, доўгія тыдні. Яны змагаліся за свой гонар палітычнай галадоўкай. Справядліва расцаніўшы арышт і зняволенне іх, як грубае парушэнне правоў чалавека, за іх уступіліся многія замежныя дзеячы, праваабаронцы, навукоўцы. Нават Б.Ельцын падчас сваёй перадвыбарчай кампаніі намякаў, што таксама аказаў уплыў на вызваленне беларускіх палітычных вязняў.

Аднак дэмакратычная рэкламная паўза з боку беларускіх уладаў працягвалася нядоўга. На мінулым тыдні Ю.Хадыку ізноў гвалтоўна арыштавалі. Яму далі 5 сутак турмы, каб пазбавіць удзелу ў тых акцыях, што праводзіліся ў Мінску з нагоды Дня Канстытуцыі і адбудуцца ў Дзень Волі. Прычына ясная, а віна якая? Ну, хто ў нашых судах высвятляе і ўзважвае віну. Віна тая, што ён ёсць Юры Хадыка. Выходзячы пад аховай міліцыянтаў з суда, Ю.Хадыка паспеў сказаць журналістам, што ён разумее паднявольнага суддзю і даруе яму неправавы прысуд. А што тычыцца самога факту прысуду, дык ён ганарыцца ім, бо пры гэтым рэжыме быць за кратамі — гонар.

Рэдакцыя мае ў сваім распараджэнні вялікі, глыбокі артыкул Ю.Хадыкі "Беларуская нацыянальная ідэя на мяжы двух стагоддзяў". Але сёння мы вырашылі адзначыць зняволенне Ю.Хадыкі ягоным анекдотам. Вось ён.

Перад Езусам Хрыстусам — тры прэзідэнты. — Госпадзі, у чым маё шчасце? — першым пытаецца Клінтан. — Тваё шчасце ў тым, — гаворыць Хрыстус, - што ты кіруеш самай багатай і магутнай краінай. — А маё шчасце ў чым? — пытаецца Ельцын. — Тваё ў тым, што кіруеш вялікай краінай, якая будуе дэмакратыю. — А маё? - не цярпіцца яшчэ аднаму прэзідэнту. — А тваё, Александр Рыгоравіч, у тым, што рукі мае прыбітыя...

Уласная інфармацыя.

Дзесяць загадаў для памяці

1. Кожны праваслаўны беларус павінен ведаць, што ён не масковец (расеяц); а каталік, што ён не паляк. Памятайце, што вы не проста "тутэйшыя людзі", а беларусы.

2. Не саромся, беларусе, гаманіць пасвойму — у роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх. Шануй сваю мову, шануй свае песьні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае — гэта спадчына дзядоў і вялікі нацыянальны скарб.

3. Богу маліцца трэба толькі пасвойму; тады вы добра зразумееце тое, што кажаце. Дзяцей вучыць трэба толькі ў роднай мове, — тады навука прынясе шмат карысьці.

4. Толькі тады цябе ўсе будуць шанаваць, як чалавека, калі сам сябе будзеш шанаваць — калі не адкінеш свайго нацыянальнага ўласнага багацьця. А першы скарб нацыянальны — гэта родная мова.

5. Толькі ў роднай, добра зразумелай мове чалавечы розум разьвіваецца і багаціць родную духоўную і эканамічную культуру.

6. Культура кожнай нацыі паасобку прыносіць карысць агульначалавечай культуры — усяму сьвету. Таксама і мы, беларусы, прынясем карысьць усім людзям на зямлі толькі тады, калі яны ў нас угледзяць нашае асобнае, вытворанае намі, а не пазычанае ў палякаў або ў маскалёў. Фундамэнтам гэтага ё толькі родная мова.

7. Быць беларусам — гэта значыць, працаваць дзеля свайго народу і разьвіваць сваю культуру і штукарства. Таксама і ўсе іншыя нацыі — й свайго ня чурайся і чужому навучайся.

8. Кожны з нас павінен памятаць і ведаць, што нашая беларуская мова ня горшая за іншыя мовы, толькі ў нашай мове было наўмысьля забаронена пісаць і друкаваць кнігі дзеля таго, каб мы аставаліся цёмнымі людзьмі і каб былі парабкамі чужых, болей разумных людзей. Ведайце, што некалькі соткаў гадоў таму назад у нашай мове пісаліся законы ў гэтым краі і друкаваліся розныя сьвятыя і сьвецкія кнігі.

9. Той чалавек, што называе нашу мову "мужыцкай", "хамскай" і кпіць з яе — гэта або правакатар, або дурны. Бо мова, у якой гамоніць 12 мільёнаў людзей, мае права быць нараўне з усімі іншымі мовамі і разьвівацца праз друк і кнігі.

10. Тыя людзі, з палякаў ці маскоўцаў, што скажуць вам: "кіньце сваю бедную, неразьвітую мову і прылучэцеся да нас — мы вам дадзем ўсё гатовенькае" — гэта, памятайце, такія людзі, што найдалей хочуць закабаліць вашую душу — ня йдзеце за імі! бо страціце сваё імя і зробіцеся нявольнікамі духа, грунтам для чужых... Толькі тады чалавек вольны — калі мае ўсё сваё.

З.Бядуля — для "Беларускага календара" за 1922 г., выдадзенага ў Вільні.

Выпрабаванне

Відаць існуе патаемны сэнс у моманце ўсялякага нараджэння — і істоты, і падзеі. І тое, што думкі аб фестывалі духоўнай музыкі "МАГУТНЫ БОЖА" нарадзіліся менавіта ў прамянях калядная зоркі, прадвызначыла ягоны лёс. Хочацца верыць, што гэта так.

Адзіны гэткі фестываль на ўсю планету! Хрысціяне ўсіх узростаў, усіх канфесій, і тыя, хто не вызначыўся ў веры, людзі розных нацый: лацінаамерыканцы і грузіны, палякі і яўрэі, беларусы і англічане, афрыканцы і ўкраінцы, царкоўныя пеўчыя з Расіі, і хатнія гаспадыні з еўрапейскага Захаду — усе яны чатыры апошнія гады без усялякіх лозунгаў і дэкларацый збіраліся пад позіркамі нашых продкаў са старажытных фрэсак магілёўскага касцёла Св. Станіслава, каб патануць у высокай, вечнай, яднаючай музыцы. Ахвотна паўтару тое, што добра вядома прыхільнікам фэсту: магіляўчане, а найбольш замежныя госці ўсхвалявана дзівіліся гэтаму цуду, створанаму групай энтузіястаў — мастакоў, музыкаў, педагогаў, святароў, журналістаў — тых, чый імпэт абудзіўся ідэяй Адраджэння.

Успамінаецца першы фестываль. Ён, як дзёрзкі ветрык, ускалыхнуў правінцыйную млявасць ліпеньскага Магілева. Незвычайная і неверагодная колькасць людзей з розных куткоў свету. Ксяндзы ў сутанах і з гітарамі, якія ладзілі карагоды прама на гасцінных вуліцах і плошчах. І пілігрымы, і студэнцкая моладзь з розных краін, што прыйшлі пешшу ад Смаленска, каб аддаць павагу высакароднай хрысціянскай ідэі, якая акрэслілася ў фестывальнай назве. І познавечаровыя ўзнёслыя спевы, і шчырыя гаворкі на розных мовах ля фестывальнага вогнішча. І непараўнальны жэст срэбравалосага маэстра Віктара Роўды, які ажывіў сотнямі галасоў фестывальных хароў велічны гімн "МАГУТНЫ БОЖА".

Другі фэст чакалі са зразуменым нецярпеннем, але і хваляваннем. На шчасце, прафесійны ўзровень і геаграфія ўдзельнікаў, якія пажадалі прыехаць у Магілёў, супакоілі і пераканалі: першы не быў выпадковасцю. Здавалася, хто зможа супернічаць з нашай "УНІЯЙ", але Гран-пры заслужана атрымаў мужчынскі квартэт з Мінску "ЧЫСТЫ ГОЛАС". Гукі аргана Уладзіміра Неўдаха ўзнеслі да лаўрэацкіх вышынь галасы салістаў Белдзяржфілармоніі Таццяны Цыбульскай і саліста Беларускай оперы Рыгора Палішчука. Удзячна былі падтрыманы і адначаны хор дзяўчынак з Баранавічаў, спеўны ансамбль дзяцей з Валожынскай школы-інтэрната. Ярка заявіла сябе асобная маладзёжная праграма. Хоць да таго часу ўжо былі ў Магілёве забаронены выступленні на адкрытых пляцоўках, але за надоўгі тыдзень свята гледачы паспелі вывучыць на памяць песні на ангельскай мове магілёўскага гурта "ЖЫВАЯ ВЕРА" і адбіць далоні на выступленнях лацінаамерыканца, што спяваў па-беларуску!

Трэці фестываль стаў трыумфам народнага харавога мастацтва. Скляпенні старажытнага касцёлу літаральна ўзрушылі магутны спеў акадэмічнага народнага хору ім Г.Цітовіча пад кіраўніцтвам Міхася Дрынеўскага. Уразілі галасы Галіцкага Хору, пакарылі журы і гледачоў вясковы ансамбль "БЯЛЫНІЦА". Трэці падкрэсліў —крыніцы духоўнасці невычарпальныя, бо выцякаюць з самых глыбінь той часткі народа, што пад усімі выпрабаваннямі не адракалася ад Бацькаўшчыны.

Папераджальным званочкам на трэцім фэсце стаў яго больш сціплы маладзёжны накірунак. Але мы разумелі, што без пастаяннага абнаўлення і маладзёжнага прытоку свята шмат губляла ў рэзанансе і мэце.

Таму пры падрыхтоўцы чацвертага было многа пошукаў і спрачак наконт таго, як прыцягнуць больш моладзі. Аднак, не ўсё ажыццявілася. Паменшылася колькасць гасцей здалёку. Мы разумелі — прыехаць на фэст станавілася ўсё даражэй па расходах, няпроста вырашаліся пытанні сустрэчы, прыёму і ўладкавання ўдзельнікаў.

Але ў чым прыбавіў чацверты, дык гэта, перш за ўсё, у выканаўчым майстэрстве канкурсантаў. Сапраўдным дзівам стала цудоўная сямёрка з Татары пад кіраўніцтвам Шаміля Юсупава — мужчынскі хор "КАТЭДРА". Пранікла ў сэрцы малітоўная шчырасць прыходскага хору з Мінскай царквы. Нельга было не

ўзрадавацца выдатным прэм'ерам, прымеркаваным да фестывалю. Імі парадавалі "САНОРЫС" пад кіраўніцтвам Аляксея Шута, мужчынская "УНІЯ", камерны хор Ларысы Іконнікавай. Прэм'ерныя старонкі — асабліва важная і трапяткая тэма кожнага свята "МАГУТНЫ БОЖА".

Як і іншыя яго характэрныя старонкі: выставы мясцовых мастакоў, фотавыставы, экспазіцыі музея гісторыі Магілёва. А чаго вартыя прафесійныя семінары з удзелам Віктара Скарабагатава, Віктара Роўды, Гайды Пікарда...

Наўмысна не ўзгадваю пра падрыхтоўчую працу, якая штогод сутыкалася з немалымі перашкодамі. Без гэтага ў нас не бывае. Тым больш, што ўсё забывалася адразу пасля першых гукаў пазыўных чарговага свята і ад выдатнага надвор'я, якое нібы сам Бог заўсёды дарыў на гэтыя дні Магілёву. Ці да крыўдаў у такія дні і хвіліны.

І раптам на апошнім фестывалі, мінулагоднім, адбылося, здавалася б, немагчымае. Цэлы значны фрагмент свята, адрасаваны маладым, быў забаронены, груба абарваны. Меркавалася далучыцца да фестывалю праекту "БЕЛАРУСКІ РОК" —фестывалю "МАГУТНЫ БОЖА". КРОК НАСУСТРАЧ". Намячалася, што будуць гучаць самыя гармanічныя кампазіцыі з рэпертуару гуртоў "НОВАЕ НЕБА", "УЛІС", "N.R.M.". Але чыноўнікі і слухаць не хацелі, хаця хутчэй наадварот: яны хацелі наладзіць над рокавымі гуртамі цэнзуру, забыўшы, што яна забаронена Канстытуцыяй. Так і чую горкія словы Віктара Скарабагатава: "Калі сёння забаранілі рок, ці не забароняць заўтра пець "Магутны Божа?!"

Выпрабаванне рокам нанесла вялікую шкоду аўтарытэту фестываля, асабліва міжнароднаму. Аднак арганізатары яго ў лепшых традыцыях Боскай справы даравалі ўладам сваю крыўду. Фонд фестывалю ў хуткім часе пачаў падрыхтоўку чарговага, пятага па ліку, а значыць, у нейкім сэнсе, юбілейнага свята. Многае ўжо зроблена: прадумана праграма, рассылаюцца запрашэнні. Вялікую цікавасць да нас выказваюць маладзёжныя ансамблі і хоры з Польшчы. Рыхтуюцца прыехаць два хоры з Італіі. Чакаюць ад нас падрабязную інфармацыю ў Германіі. Зацікавіўся фэстам музычны цэнтр "МУЗА" з Грузіі. Адгукнулася Масква — патрыяршы хор і прадзюсарскі цэнтр "РУСКІ ІМПРЭСАРЫЯ" ўпэўнілі нас ва ўдзеле лепшых харавых калектываў з Расіі. Атрымана заява ад дзіцячага хора Казанскага цэнтра імя А.Аліша.

Але. Але, на вялікі жаль і дзіва, дасёння няма афіцыйнага адказу ад гарадскіх уладаў на заяву фонда фестываля аб яго правядзенні і падтрымцы. Вялікая ў нас праблема і са сродкамі, якіх патрабуецца шмат. Але заснавальнікі фонда і сябры журы аднадушныя ў думцы: фестываль павінен адбыцца! Можна зрабіць гэта сціпла, мы не прэтэндуем на размах Славянскага базару. Справа густу, але ж высокая музыка непараўнальная з эстрадай. Высокая музыка без падтрымкі не гучыць нідзе ў свеце. Колькі людзей за гэтыя гады павярылі ў магчымасць яднання, наблізіліся да веры, адчулі маральнае ўздзеянне класічнай і народнай музыкі. Нельга, недапушчальна іх падманўць! І верыцца, што калядная зорка —сведка нараджэння ідэі аб арганізацыі ў Магілёве фестываля "МАГУТНЫ БОЖА" — правядзе фэст праз цяжкасці і непаразуменні на светлую дарогу да людзей.

АЛЕНА БАРЫСАВА, сябра Фонда міжнароднага хрысціянскага фестываля духоўнай музыкі "МАГУТНЫ БОЖА".

На гэтых здымках адлюстраваны ўсяго два эпізоды з першага міжнароднага фестывалю ў Магілёве "МАГУТНЫ БОЖА". Успомніце гэтыя шчаслівыя моманты радасці, адпачынку, новых знаёмстваў, далучэння да духоўнай музыкі... Колькі яшчэ было за чатыры фестывалі выдатнейшых эпізодаў, што па-добраму ўплывалі на свядомасць, мараль і настрой шматлікіх гледачоў. Успомніце, бо зусім не здаецца неверагодным, што Магілёў (у асобе ўладаў, вядома) адмовіцца ад гэтага свята. Як адмаўляемся мы сёння ў сваёй краіне ад ўсяго, што не выходзіць з кабінетаў улады або не атрымала "высокай" падтрымкі сённяшняга адзінага гаспадара дзяржавы.

Кавалачак Польшчы ў Магілёве

На франтоне гэтага дома так і напісана "Дом Польскі". Знаходзіцца дом на вуліцы Карла Лібкнехта і з'яўляецца сапраўдным ўпрыгожваннем гэтага кутка горада. Кажуць, калісьці ў гэтым месцы быў гатэль з польскай назвай. З цягам часу стары будынак прыйшоў у заняпад. Ад поўнага разбурэння яго выратавалі намаганні будаўнікоў і рэстаўратараў з Кракава. Старшыня Магілёўскага аддзялення Саюза палякаў пан Юры Адольфавіч Жаравовіч лічыць, што іхні дом —адзіны "прадстаўнік" збудаванняў мінулага стагоддзя, адроджаны літаральна з руін.

Днямі мне ўдалося пагутарыць з Юрыем Жаравовічам. А размова ў нас была вось аб чым. Юры Адольфавіч нагадаў у якім жахлівым стане прыняло польскае грамадскае таварыства старадаўні будынак, у якім калісьці размяшчаўся гатэль, пазней былі тут і розныя савецкія канторы, і проста жылі людзі, як у кватэрах. Але ніякіх зручнасцяў для іх тут не было, а дом прышоў да поўнага заняпаду. Рэстаўраваць яго прыехалі ў 95-ым годзе будаўнікі дзвюх прыватных фірмаў з Кракава. І выдатна справіліся са сваёй задачай. А заплаціла за ўсё грамадская арганізацыя "ПОЛЬСКАЯ САДРУЖНАСЦЬ".

— З моманту афіцыйнага адкрыцця вашага дома прайшло паўгода. Што ўдалося зрабіць за гэты час?

— Найперш, працуюць курсы польскай мовы. Адбыўся вечар нашай паэткі Віславы Шымборскай, пабываў у нас Варшаўскі тэатр. Былі вечары польскай кухні. Займаецца дзіцячы хор. Будзем пашыраць магчымасці для адпачынку, прыцягнення да нас людзей. Ствараем польскую бібліятэку, тэлезалу для прагляду спадарожнікавых праграм, запланавалі новыя цікавыя сустрэчы, выставы, канцэрты. Намецілі кантакты з падобнымі Дамамі ў Гародні і Баранавічах.

— Дом Польскі існуе толькі для палякаў, якія ў нас жывуць або прыязджаюць у Магілёў?

— Канешне, для любога паляка ён родны дом, як амбасада ці консульства. Але найперш існуе ён для тых магіляўчан, якія цікавяцца нашай краінай, моваі, культурай. Нашыя дзверы адчыненыя абсалютна для ўсіх. Наш Дом — сімвал і ачаг братэрства і сяброўства польскага і беларускага народаў, якія жылі калісьці ў адзінай дзяржаве, у якіх вельмі блізкія менталітэт, мова і культура. Каб не ізалявацца адзін ад аднаго на цяперашнім вітку гісторыі, мы і працуем.

АЛЕСЬ ФАМІН.

Афиша

Этому толстяку не нужен ваш бифштекс

На будущей неделе в Могилев пожалует самый толстый человек мира! Не пугайтесь, что он опустошит городские холодильники: толстяк сделан всего лишь из воска. Приедет он не один, а в компании таких же "самых-самых", вошедших в Книгу рекордов Гиннеса, политиков и исторических деятелей. Уже целый год экспозиция Санкт-Петербургского Музея восковых фигур на Фонтанке с успехом колесит по Беларуси. Теперь настал и наш черед увидеть восковых "людей", сработанных по образу и подобию прошлых или нынешних кумиров.

Разместятся фигуры в Музее декабристов, как раз по соседству с еще двумя экспозициями, которые можно увидеть здесь в эти дни: фотовыставкой Михаила Гозмана —известный могилевский фотомастер снимает жизнь, женщин и собак, и работами преподавателей и учащихся городской детской худшколы "Христианство и современность". Кстати, эту выставку ДХШ повезет осенью в Германию.

Музеи как сговорились по части детских рисунков и пейзажей. Работы учеников худшколы можно увидеть еще и в музее В.К.Бялыницкого-Бирули. Зато выставочный зал областного отделения Союза художников "переключился" весной на "космическое": здесь показывает свои картины гомельский художник Юрий Москаленко. Его интересуют тонкие миры, в которых, как говорит автор, "мы буквально купаемся, но не видим их или не замечаем". Выставка так и называется — "О незримом".

На смену одним "неземным" мотивам скоро придут другие: выставочный зал, возможно, покажет нам картины Рерихов. Правда, как всегда копии.

А поклонникам традиционного реалистического искусства можно заглянуть в областной художественный музей, где выставлены пейзажи, натюрморты и тематические картины Святослава Федоренко, преподавателя Белорусского лицея искусств, сына известного могилевского художника Николая Федоренко. По мнению тех, кто уже побывал на этой выставке, лучше всего ее автору удаются портреты, в которых он умеет передать внутренний мир, пытается уловить неуловимое, что, нередко, и оказывается в человеке главным.

Л.З.

Запрашаем на выставу!

На выставу сталічнага фотамастака Сяргея Кавалёва запрашае магілёўцаў гарадскі Цэнтр культуры і дасуга.

Адкрыццё выставы адбудзецца 22 сакавіка, а 14-й гадзіне. А працаваць яна будзе да 8 красавіка.

Ул. Інф.

Гісторыя свята з абцяжарваючымі абставінамі

Напярэдадні 8 сакавіка работніцы Магілёўскай фабрыкі народных промыслаў, перабраўшы ўсе іншыя спосабы і спробы атрымаць заробленыя за тры месяцы грошы, рашыліся на крайнюю меру. Крайнюю з тых, якая пазначана ў ліку правоў грамадзянаў у іх абароне сваіх эканамічных і сацыяльных інтарэсаў у 41 артыкуле новай Канстытуцыі. І крайняя па ступені адчаю. Жанчыны аб'явілі страйк з галадоўкай.

Але чаму аб'явілі? Здаецца, галадоўка ў гэтым калектыве і без таго была перманентным станам. Для даведкі: заробак работніцы фабрыкі складае ад 200 да 500 тысячаў рублёў.

Ліст з 46 подпісамі ў службу дзяржаўнага кантролю, гарвыканкам і "родны" Кастрычніцкі райвыканкам, змяшчаў ў сябе папярэджанне аб намерах галадаць і баставаць.

Сёмага сакавіка жанчынам выплацілі грошы за два месяцы. Здавалася, што ўсё супакоілася. Аднак, як паведаміла старшыня прафкама фабрыкі Ніна Спічакова, прадпрыемства мяркуецца наогул ліквідаваць. Такое рашэнне прыняла вышэйстаячая галіновая інстанцыя ў Мінску. Жанчынам параілі самім шукаць новыя месцы работы. Аб гэтым 46 работніц, з якіх 15 інваліды, даведаліся напярэдадні другога свята — дня Канстытуцыі, у якой 41 артыкул гарантуе права на працу, як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека.

Сітуацыя на прадпрыемстве пакуль не вызначана.

А.К.

По мосту красоты — в магическую зону

В первый день весны красиво и ненавязчиво заговорило ALTER EGO. Семь лет бродило оно, а это могилевское фототоварищество, по зарубежным салонам и форумам в поисках счастья, признания и, наконец, вернулось под крышу музея декабристов. А виновником стал молодой могилевский фотохудожник Михаил Гозман.

Так уж повелось, что плавный переход к сути предмета никогда не обходится без изящных женских реверансов и элегантного жестикулирования мужскими шляпами, имеющими конкретную цель — отблагодарить меценатов, без которых событие могло бы и не состояться. Могилевская городская ассоциация "КРУГ ДРУЗЕЙ", поддерживая гениальную мысль Достоевского о спасительной красоте, не в первый раз делает благородный жест в сторону творческих людей.

Не вдаваясь в долгие рассуждения по поводу названия выставки и множества работ на ней, попытаюсь сказать о самом интересном. Творчество интраверта — а Михаил совершенно однозначно "вещь в себе" — оставляет ощущение глубокой лиричности, затаенной грусти и даже исповедальности. Он создает такие прозрачные, в чем-то неоконченные вещи, что невольно чувствуешь существование потусторонности. Плюс умение мастера дать всегда тонкое и точное название каждой работе. Все вместе делает фотопроизведение искусством.

Работы Михаила Гозмана кому-то могут нравиться, кого-то раздражать, кого-то вдохновить, а у кого-то и вызвать творческую ревность. Но то, что они не талантливы — так не скажет никто. Придите на выставку и вы убедитесь, что это так. Музей декабристов, ежедневно.

Саша Гжельская.

1. Шчаслівыя імгненні віншавання аўтара выставы М.Гозмана.
2. Дзве фотаработы: "Раніца", "Жаночы партрэт".

"Торгэкспа" больш няма?

Па непацверджаных звестках, днямі была ліквідавана сумнавядомая фірма "Торгэкспа". Пасля цэлага шэрагу скандалаў, звязаных з кантрабандай спірту і вінагарэлачных вырабаў, якія ажыццяўляла памянёная фірма, улады палічылі за лепшае зліквідаваць яе. Па звестках з той жа крыніцы, установа славутага "Іван Іваныча" арганізавала знішчэнне ўсіх дакументаў, якія юрыдычна засведчвалі факт заснавання "Торгэкспа". Адначасна, заснавальнікі гэтай фірмы ўсе яе актывы "перайменавалі" ў актывы другой кампаніі з назвай "Белая Русь". У "Белую Русь" перацёк пераважна і персанал "Торгэкспа".

Пятро ЗАХАВАНЫ.

Сітуацыя, якую можна назваць рэвалюцыйнай

Не, вядома, справа не ў тым што нашаму слаўнаму гораду на Дняпры пагражае змена грамадска-палітычнай фармацыі. Проста ўсім вядомы выраз, кароткі і змястоўны: "вярхі не могуць, а нізы не жадаюць", як нельга дакладней і лепш вызначае той стан, што склаўся ў Магілёве з вывазам смецця ў прыватным сектары горада. Размешчанага, зазначым, галоўным чынам, уздоўж Дняпра. Стыхійныя звалкі смецця сталі неад'емнай часткай яго пейзажу.

Пераканаць людзей, гаспадароў 16-ці тысячаў прыватных дамоў, уяўляецца непасільнай задачай. Ніяк не прымаецца за аргумент і сімвалічная цана чысціні - 2 тысячы рублёў у месяц з чалавека. Менавіта такія грошы, але з перадаплатай за год, (сумы і ў гэтым выпадку несур'ёзнай, якой сярэднестатыстычнай беларускай сям'і з трох чалавекаў не хопіць нават на набыццё двух, калі не яшчэ менш, кілаграмаў самай папулярнай у нашым народзе меркі дабрабыту — каўбасы варанай) прапануе заплаціць насельніцтву прыватнага сектара за свае паслугі адпаведнае спецаўтапрадпрыемства.

Людзі супрацьўляюцца і працягваюць пераважна ў цёмны час сутак ствараць помнікі ўласнай бескультурнасці. Чым учыняюць велізарную шкоду прыродзе.

Прырода помсціць. Самая буйная зараз на Дняпры флатылія — гэта адпрацаваныя рэшткі бытавога жыцця людзей. Вось-вось з паводкай яна знімецца з якара.

Магілёўскія ж гарадскія ўлады, распісаўшыся ва ўласным нядужжы ўгаварыць людзей заключаць дамовы са спецаўтапрадпрыемствам, і разумеючы сваю неправамоцнасць прымусіць да гэтага, — вырашылі пайсці іншым шляхам. У якім рэвалюцыйна новага нічога няма. А ўсё элементарна. Правесці інвентарызацыю кожнага прыватнага падворка, праверыць яго адпаведнасць на шматлікія нарматывы — і потым... штрафаваць, штрафаваць, штрафаваць. З прыбіральняй не ўсё добра —санэпідэмстанцыя за цябе возьмецца. Бруд і хлам каля твайго плоту з боку вуліцы — наведаецца домакіраўніцтва. На самых-самых парушальнікаў можна будзе і экалагічную міліцыю з участковым наклікаць.

Дык, мабыць, на гэты раз "вярхі" змогуць, а "нізы" захочуць?

P.S. Сёння адна з самых прыкметных, не прыкмеціць яе проста нельга, стыхійных магілёўскіх звалак смецця размясцілася прама пад апорамі новага маста цераз Днягро. Год назад права першым праехацца па масту было прадстаўлена прэзідэнту. І мост, і ўсё навокал блішчэла. Але ўрачыстасць скончылася даўно...

А.К.

Памяці Уладзіміра Голуба

На мінулым тыдні, 15 сакавіка, памёр Уладзімір Голуб... Гэта такая смерць, пра якую можна сказаць: чалавека згубіла сістэма, і ён сам у гэтым ёй дапамог.

Малады выкладчык філасофіі, на лекцыі якога збягаліся студэнты ўсіх факультэтаў машынабудаўнічага інстытута, з рамантызмам, што заўсёды адрознівае чалавека добрай душы і светлага розуму, і нават з залішняй аптымістычнасцю ўспрыняў ён перамены, якія ўварваліся ў застойнае грамадства СССР напрыканцы 80-х гадоў. Перамены набіралі тэмп, імперыя разбуралася, у нашай краіне адраджалася нацыянальная самасвядомасць. З'явіліся людзі, якіх адны называлі дэмакратамі, а другія... вы помніце як.

Уладзіміра Голуба можна было тады ўбачыць і сустрэць на кожным мітынгу (ах, тыя першыя мітынгі пачатку 90-х гадоў, на якіх адзін за адным свабодна выступалі "ярыя нацыяналісты", партыйныя сакратары, назаўсёды скалечаныя камунізмам ветэраны і юныя "разбуральнікі асноў", якія шакіравалі мітынговыя натоўпы нязвыклым да іх зваротка́м "госпада"...), у залах сесій тады яшчэ "народных" дэпутатаў, на вечарова-начных сходах рамантыкаў дэмакратыі (тады яшчэ няхай і ў чардачным, але ўсё-такі дом-саветаўскім пакоі) — і ўсюды ён лёгка, з настроем, востра і красамоўна перацягваў аўдыторыю, нават адпачатку варожую, на свой бок. Бо куды ж было падзецца ад яго логікі, шчырасці і ведаў! Ён быў у Магілёве прызнаны дэмакрат, першы ў горадзе народнафронтаўскі лідэр, — новую краіну, якая быццам бы пачыналася, павінны былі адраджаць і ствараць такія людзі.

Не давялося, усё ў грамадстве паціху загасла, наменклатура ачуняла, людзі суцішыліся і не паверылі самім сабе, многія з "дэмакратаў", пагуляўшы ў палітыку, калі было можна і бяспечна, адышлі ў цень, а то і дыскрэдытавалі сябе і светлыя намеры. Пачалася ў нас шпаркая адбудова іншай краіны — той, якую мы бачым зараз.

Чарнавая, руцінная, карпатлівая работа на няўдзячнай ніве дэмакратыі і нацыянальнага адраджэння аказалася Уладзіміру Голубу, на жаль, не па сілах. Але "адмываць" сваё імя пры новай уладзе ён, як многія з паплечнікаў, не стаў. Ён пакрыўдзіўся на людзей: не хочаце добрага жыцця — жывіце як хочаце. І адышоў ад усяго і ўсіх. Усё пачало рассыпацца: сям'я, сябры, высакародныя намеры. На іх месца заступілі "ўсеразуменне" і гарэлка. Яна хутка і паставіла кропку.

Сістэма вынесла свой прысуд, а ён не здолеў і не захацеў ад яе абараняцца. Думаецца сёння пра гэта з болем, горыччу і адчуваннем віны... Спакою табе, Уладзімір, там, куды Ты сышоў.

СЯБРЫ.

Вымушаная ветлівасць

За руку мусяць весці падпіўшых грамадзян у Шклоўскі выцвярэзнік.

Справа ў тым, што гэтая ўстанова не мае аўтатранспарту, і таму ягоныя супрацоўнікі нават вымушаныя часам несці на руках людзей, якія знаходзяцца ў стане алкагольнай непрытомнасці. А што рабіць, не кідаць жа на вуліцы...

Іван ЗАСАДА.

Абвешчаны ў краіне курс на "рынкавы сацыялізм" даволі паспяхова ажыццяўляецца. Такія сцэнкі, якую вы бачыце на здымку, можна назіраць часта. Гэта гаворыцца не ў папрок жанчынам-працаўніцам, якія на старасці гадоў вымушаныя асвойваць гандлярскую прафесію. Мы ім удзячны, у каго яшчэ можна ў любы час, у самых незвычайных месцах і даволі танна набыць цыгарэты, напоі, семкі і нават, як бачыце "прадукцыю сельгасвытворчасці".

Рэдактар Генадзь СУДНІК

Інфармацыйна-аналітычная газета, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газета выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове..

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 212030 г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.

ТЭЛЕФОНЫ: 31-04-15, 22-97-82

Газета набрана і надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.М.Свярдлова. Зак. 1. Тыраж 3000 асобнікаў.